УДК 821.161.3.09 + 821.161.2.09

*М.І. Чмарава*

# ВЫЯЎЛЕННЕ АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАГА І НАЦЫЯНАЛЬНАГА Ў ТВОРЧАСЦІ ЦЁТКІ І ЛЕСІ УКРАІНКІ

Алаіза Пашкевіч-Кейрыс (Цётка) – першая беларуская паэтка і пісьменніца, асветніца, настаўніца, публіцыст і рэдактар, за якой назаўсёды замацавалася азначэнне “паэтка рэвалюцыі”. Аднак, акрамя



хив библиотеки МГУ имени

таго, Цётка – шчыры лірык. Агульнасць названых узаемавыключальных адзнак падкрэслівае і вызначае яркую індывідуальнаць Цёткі-паэтэсы, чыя творчая спадчына да нядаўняга часу разглядалася выключна як увасабленне рэвалюцыйнага ідэалу. Пры гэтым, бясспрэчна, заніжалася роля выяўлення агульначалавечых і нацыянальных матываў творчасці Цёткі. Леся Украінка – паэтка з яскравай украінскай нацыянальнай прыродай, патрыётка роднай зямлі. Яе творчасць займае належнае месца не толькі ва ўкраінскай літаратуры, але і ва ўсім літаратурным працэсе славянскіх народаў канца XIX – пачатку XX стагоддзя. М. Рыльскі называе Л. Украінку "адной з самых арыгінальных сусветных паэтаў", а яе творчае слова – "вялікай справай" [1, с. 138]. Але ж складаны, мнагааспектны мастацкі свет твораў паэткі працяглы час заставаўся амаль нявывучаным. У папярэднія часы ў літаратуразнаўстве крытыка таксама звяртала ўвагу амаль выключна на рэвалюцыйную лірыку, вызначала яе як найбольш значную і галоўную ў творчасці Л. Украінкі. Сёння, атрымаўшы магчымасць у поўнай меры карыстацца архіўнымі дакументамі, навукоўцы вялікую ўвагу надаюць разгляду біяграфіі паэтэсы. Пры гэтым колькасць прац, накіраваных непасрэдна на вывучэнне творчай спадчыны Л. Украінкі, застаецца даволі абмежаванай. Таму існуе відавочная неабходнаць комплекснага агляду творчасці паэткі.

Станаўленне беларускай і ўкраінскай пяснярак адбывалася пад непасрэдным уплывам знакамітых папярэднікаў і таленавітых сучаснікаў. Так, на прозу і паэзію Цёткі (у дачыненні да творчага метаду) вялікі ўплыў мела творчая спадчына Францішка Багушэвіча. Характар багушэвічавага пісьма бачны, на думку І. Быхаўца, ужо ў ранніх творах Цёткі ( "Нямаш, але будзе" (1904), "Музыкант беларускі" (1904) ) [2, с. 37–42]. Блізкасць да творчасці Багушэвіча падкрэсліваюць, бясспрэчна, і выразныя Цётчыны псеўданімы – Гаўрыла, Гаўрыла з Полацка, Банадысь Асака, Тымчасовы, Мацей Крапіўка (усяго каля 28 псеўданімаў). Абраныя імёны акрэсліваюць мастака (Цётку) як чалавека з народа, не пана, які заклапочаны тымі ж справамі і тымі ж турботамі, што хвалююць кожнага простага беларускага мужыка. Трэба адзначыць, што Цётка сама выразна акрэслівае творчы ўплыў Мацея Бурачка ў прадмове да зборніка "Скрыпка беларуская". Бо, згодна ёй, менавіта "Дудка беларуская" падштурхнула да разважанняў, вынікам якіх з'явіўся першы зборнік паэткі: "Прачытаўшы тую "Дудку", я сказаў: "Дзякуй табе, Мацей Бурачок! Чэсць і слава таваму слову! А ты, "Дудка" грай і мне голас дай. З таго дня і я пачаў майстраваць інструмант" [3, с. 47].

Удзячнасць гучыць у кожным сказе прадмовы і адгукаецца ў кожным вершы. Паэзія Францішка Багушэвіча прываблівае Цётку, бо арганічна



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

змяшчае шчырасць, рэалізм, павагу да беларускага народа і яго мовы, г. зн. усё тое, што Цётка паклала ў аснову свайго творчага метаду. Аднак, нягледзячы на відавочны ўплыў Мацея Бурачка, нават першыя творы Цёткі – гэта выключна самабытныя, арыгінальныя і яскравыя вершы. Да вызначальных ранніх твораў Цёткі адносяць і вершы "Мужыцкая доля" (1903) і "Мужык не змяніўся" (1903). Змест вершаў звернуты да простага люду і яго долі. У "Мужыцкай долі" лірычны герой, звычайны селянін, змучаны бясконцымі падаткамі і непасільнасцю праў, распавядае пра цяжкое жыццё і няспынную працу, звяртаецца да сваёй долі: "Дзе ж ты, мая доля, дзе ж ты захавалась, без цябе няволя і бяда засталась" [4, с. 75]. Верш з'яўляецца споведдзю набалелага, безвыходнай роспачы. Аднак пры гэтым найвялікшай гістарычнай несправядлівасцю па-ранейшаму застаецца жыццё селяніна – сапраўднага працаўніка і гаспадара зямлі – у цемры і пакутах сотні стагоддзяў.

Адсюль, вершы аб'яднаны агульнай тэмай, матывамі, мэтай і характаразуюць Цётку як пясьнярку мужыцкага жыцця, гора і нядолі. Рысы, увасобленыя ў вобразе мужыка (любоў да працы, глыбокае пачуццё справядлівасці, маральная чысціня, духоўная моц і г.д.), ствараюць абагульнены партрэт беларускага селяніна, пераканаўчы і яскравы.

Аднак трэба адзначыць, што, у параўнанні з далейшай творчасцю Цёткі, селянін яшчэ не набыў рысы актыўнага змагара за ўласныя правы. У першых вершах – гэта, хутчэй, ахвяра сацыяльных з'яў і гістарычнай несправядлівасці. Выразна адчуваючы сацыяльную няроўнасць, селянін яшчэ далёкі ад глыбокага ўсведамлення свайго гістарычнага і грамадскага прызначэння.

Такім чынам, калі вытокі творчасці Цёткі – у спадчыне Францішка Багушэвіча, то Л. Украінка шмат у чым працягвала традыцыі і абапіралася на творчасць Т. Шаўчэнкі. Дарэчы, сама пісьменніца не аднойчы звярталася да постаці песняра. Памяці вялікага Кабзара прысвечана некалькі асобных вершаў ("На гадавіну Шаўчэнка", "У гадавіну" і інш.). Не абмінае паэтка ўвагай і іншых культурных дзеячаў сучаснага і мінулага: С.Я. Надсона ("Домік Надсона ў Ялце" (1891)), А. Судаўшчыкову ("Сон" (1891)), С. Мяржынскага ("На паўслове размова перапынілася..." (1898)) і інш. Значная колькасць вершаў, прысвечаных родным, а таксама сябрам і знаёмым, акрэсліваюць постаць Л. Украінкі як асобы глыбока ўспрымаючай турботы блізкіх людзей. Яе хвалявала ссылка цёткі ("Надзея" (1880)), трагедыя сяброўкі, маці якой саслана ў Сібір ("Маці-нявольніца" (1895)) і інш. Са шчырай любоў'ю і замілаванасцю Л. Украінка звяртаецца да сястры ("Вяснянка"(1890)), брата ("Запеў" (1891)), стрыечнай сястры – паэтэсы А.М. Драгамонавай ("Радзе на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

памятъ" (1895)), нават асобнай сям'і М. Камарова ("Вандроўка да мора" (1893)). Цыкл лепшых лірычных вершаў Л. Украінкі напісаны ў 1898 – 1901 гг. і прысвечаны блізкаму сябру – С.К. Мяржынскаму, у апошнія гады свайго жыцця цяжка хворага на сухоты. У вершы "Абняць цябе, нібыта плюшч, жадаю…" (1901) створаны пераканаўчыя вобразы мужчыны, слабога і змучанага, і моцнай духам жанчыны, здольнай абараніць свайго каханага, бо яго страта ўяўляецца як уласная гібель. Я.Р. Цяпіна адзначае, што ў вершы назіраецца збліжэнне "катэгорый "каханне" і "смерць" у такой ступені, што матыў кахання, які вядзе за сабою смерць, абсалютызуецца: у тэксце гучыць перакананне ў тым, што пачуцці лірычнай гераіні выклікаюць сабою смерць любога іншага мужчыны, які будзе яе каханым" [5, с. 128]. Прычынай гэтага будзе "не фатальная прадвызначанасць, але сама прырода пачуццяў лірычнай гераіні" [5, с. 129]. Дарэчы, характар вырашэння дадзенай праблемы ў творчасці Л. Украінкі гэтага перыяду даволі разнастайны:

- Лірычная гераіня не здольная збавіць свайго каханага ад хваробы ці быць з ім, але моц пачуццяў ператварае яе ў дрэва на магіле сябра, якое зберагае яго ад спёкі і завірухі ("Каліна", 1901). У гэтым выпадку, кажучы словамі Я.Р. Цяпінай, "патрэба ў тым, каб абараніць каханага, пераносіцца і ў будучыню, за межы яго смерці" [5, с.130].
- Яднанне лірычнай гераіні і каханага пасля смерці апошняга. Гэта выяўляе жаданне непрымання рэальнай страты насуперак розуму. У даным выпадку менавіта смерць злучае каханых у нейкім іншым, незямным свеце ("Гавораць вусны: "Ён навек загінуў!", 1901).
- Зварот да сусветнавядомых гістарычных асоб, пошук у іх жыцці момантаў кахання, адпавядаючых мэтам і думкам паэткі ("Забыты цень", 1898) (Дантэ – Беатрычэ (жонка Дантэ). Тут Л. Украінка выкрывае носьбіта якасна новага любоўнага пачуцця і інш.

Такім чынам, інтымная лірыка, у якой спалучаюцца традыцыйныя вобразы дзяўчыны, чыё сэрца пакутуе ад непадзельнага кахання, і вернай сяброўкі, ахоўваючай магілу каханага, арганічна спалучаюцца і суіснуюць у межах творчасці паэткі.

Матывы любові да Украіны з'яўляюцца яшчэ на пачатку творчага шляху і пранізваюць усю творчасць Л.Украінкі. Паэтка ўслаўляе прыгажосць роднага краю, "цёмныя лугі", "сасновыя лясы", "блакітны высокі небасхіл" і інш. ("Вандроўка да мора", "І ўсё-такі к табе...", "Слёзы-перлы" і інш.). Любоў да Радзімы разнастайна выявілася ў творчасці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Лесі Украінкі – і ў непасрэднай форме лірычных адступленняў, і ў іншасказальнай форме ў драматычных паэмах, перанесеных у былыя часы і іншыя краіны, і, нарэшце, у бесперапынным жаданні ахапіць розумам і адчыніць да канца скарбніцу ўкраінскай народнай творчасці.

У грамадска-палітычных умовах пачатку XX стагоддзя роля мастакоў і пісьменнікаў была выключна важная. Адказнасць сваёй справы адчувае і Цётка, і Леся Украінка. Цётка ў вершы "Музыкант беларускі" (1904) закранае праблему мастака і мастацтва, яго вызначальнай ролі для будучага краіны і народа. Ад жаласлівай песні музыкі "пташкі задрыжэлі, пчолкі сціхлі ў вуллях", толькі "яе ноты сыты не пачуе" [3, с. 78]. Аднак гэта не здолее перашкодзіць музыканту і скрыпцы, якая ў вершы набывае рысы жывой істоты, сцвердзіць "хамску" песню, звярнуцца "да ўсяго свету".

Увогуле, тэма мастацтва, паэта, творцы – асноўная тэма асобнага Цётчынага зборніка "Скрыпка беларуская". У вершах зборніка ўсебакова раскрываюцца эстэтычныя погляды Цёткі, яе разуменне ўзаемаадносін мастацтва і рэчаіснасці, мастака і народа. Для Цёткі сапраўдны мастак – чалавек, назаўсёды злучыўшы свой лёс з лёсам сваёй бацькаўшчыны, той, хто жыве думкамі роднага краю, яго мінулым, сучасным і будучыняй. І Цётка, у сваю чаргу, падкрэслівае свой зварот да двух найбольш значных на той момант для пісьменніка з'яў: грамадска-палітычных, вострасацыяльных ("Заплачу на скрыпцы аб мужыцкай долі… толькі яе ноты сыты не пачуе") і мастацка-асветніцкіх ("ну і грай жа, скрыпка, хай ляціць там песня, Або свет пачуе, Або душа трэсне"), хоць і не выклікае сумнення, што апошнія разгортваюцца ў межах першай ("Музыкант галосіць, скрыпка не махлюе, Хутка "хамску" песню ўсенек свет пачуе"). Дарэчы, В. Коўтун справядліва называе гэты апошні слупок той "творчай звышзадачай", якая "сталася своеасаблівым Цётчыным наказам для многіх будучых пакаленняў нашчадкаў" [4, с. 94].

Пытанне грамадскай ролі паэзіі, увогуле, прызначэння пісьменнікаў і творцаў, займае значнае месца і ў творчасці Лесі Украінкі. Апошнія павінны служыць народу, спрыяць выхаванню людзей, узбагачаць іх унутраны свет. У вершы "Спявак" (1889) Леся Украінка стварае вобраз паэта, які падобна "голосистым соловьям", пяе любоўныя песні, а пад час цяжкіх выпрабаванняў для Радзімы забывае аб сваім асноўным прызначэнні.

У сваю чаргу вобраз паэта, сапраўднага народнага песняра, створаны ў паэме "Лясная песня" (1911). "Лясная песня" названа паэткай "драмай-феерыяй" і ўяўляе сабой калейдаскоп фарбаў, пахаў, народных песень, казак і паданняў. Яна больш за ўсё спалучаецца з багатым светам



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

украінскай народнай творчасці. Прырода Валыні складае маляўнічае хараство "Лясной песні", у якім спалучаецца фантастыка і рэальнасць. Тут Леся Украінка творча пераймае традыцыі Тараса Шаўчэнкі, які выводзіў у сваіх баладах стварэнні народнай фантазіі, А.С. Пушкіна, Н.В. Гогаля, Квіткі-Аснаўяненка, у творах якіх гублялася мяжа паміж фантастыкай і явай, рэчаіснасцю.

Драматургія Лесі Украінкі справядліва лічыцца вянцом яе творчай спадчыны. Здольная да філасофскіх і розных грамадскіх спрэчак, яна высока цаніла дыялектыку думкі, і ў ідэйных сутыкненнях герояў і гераінь гучыць рэха з'яў і падзей, якія хвалявалі паэтку. У межах драматургіі Леся Украінка – наватар, бо да такіх вышынь філасофскіх абагульненняў не ўздымаўся ніхто з яе папярэднікаў. Вялікія палотны, якія стварала Леся Украінка, патрабавалі мноства разнастайных персанажаў. У яе драматычных творах дзейнічаюць героі антычнага свету і рыцарскага сярэднявечча, біблейскія і евангельскія вобразы, хрысціяне першага стагоддзя нашай эры і г.д. У творчай постаці паэткі скрыжоўваюцца мастак, творчая асоба і мысліцель, філосаф. Яна майстэрскі знаходзіла вобразнае выяўленне для сваіх філасофскіх, грамадска-палітычных і эстэтычных поглядаў.

Але калі Леся Украінка наватар у галіне ўкраінскай драматургіі, то Цётка з'явілася адной з пачынальніц суб'ектыўнай прозы ў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя. У празаічных творах яскрава выяўляецца майстэрства псіхалагічнага аналізу. Акрамя таго, жанравая разнастайнасць прозы пісьменніцы надта багатая. Гэта і апавяданне-пракламацыя "Прысяга над крывавымі разорамі" (1906), навелы "Міхаська" (1914), апавяданні для дзяцей, анекдатычныя апавяданні "Разумныя, ды не на дурня напалі" (1906), мастацка-эпісталярныя пісьма "Навагодні ліст" (1908), падарожныя нататкі "З дарогі" (1914), "Успаміны з паездкі ў Фінляндыю" (1914).

Да спецыфічных агульных рыс апавяданняў Цёткі прылічым маральную скіраванасць, увагу да элементаў народнага жыцця, трагічны пафас, матыў самоты, а таксама яскравы, запамінальны фінал. Наватарства Цёткі, якое, дарэчы, зазначаюць амаль усе даследчыкі (В. Коўтун, В.А. Максімовіч, Л. Арабей і інш.), праявілася таксама ў стварэнні выразных вобразаў дзяцей-пакутнікаў ("Міхаська"), інтэлігентаў ("Зялёнка"), агульнага сумарнага вобраза рабочага, салдата і парубка ("Прысяга над крывавымі разорамі"). Такім чынам, празаічная спадчына Цёткі таксама вызначае паэтку як асобу таленавітую, эмацыянальную, здольную да філасофскіх абагульненняў, якая была, па словах В. Коўтун, "захоплена справай мадэліравання беларускай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

празаічнай класікі, ідэямі асветніцтва і нацыянальна-культурнага адраджэння" [4, с. 128]. Цётчыны апавяданні не вызначаюцца асабліва вялікімі памерамі, але яны, як слушна прыкмячае В. Коўтун, "кандэнсавалі ў сваім змесце важкасць буйнога мастацкага маштабу і склалі вагомую частку класічнай літаратурнай спадчыны" [4, с. 128].

Постаць і творчасць Цёткі неад'емна звязаны са стварэннем беларускай літаратурнай класікі і вытокамі нацыянальнага адраджэння, гісторыяй. Сваёй творчасцю паэтка сцвярджала гістарычную самадастатковасць беларускай нацыянальнай ідэі, аддаючы перавагу хрысціянскім, сацыяльна-дэмакратычным і нацыянальна-вызваленчым поглядам. Немагчыма не адзначыць таксама наяўнасць унутраных супярэчнасцей творчасці, абумоўленых сутыкненнем глыбока лірычнай натуры з неабходнасцю заклікаў да змагання (лірычнасць, сум па роднай старонцы, унутраная засяроджанасць, любоў да хараства прыроды, палкія заклікі да народнай рэвалюцыі, змагання за долю і г.д.). Пры гэтым сутнасць і характар Цётчынай спадчыны грунтаваліся на глыбокіх роздумах пра народны лёс, гісторыю і будучыню Бацькаўшчыны. Таму не дзіўна, што творчым запаветам і галоўнай задачай творчасці Цёткі з'явілася жаданне спрыяць таму, каб "хутка хамску песню ўвесь свет пачуў" ("Музыкант беларускі"). Дарэчы, сама А. Пашкевіч апантана выконвала сваю місію нацыянальнай паэткі. У дасягненні творчай мэты Цётка шмат у чым абапіралася на фальклорную аснову (вершы "Адкрый, пані, добра пані...", "Тры кветкі", навуковае даследаванне "Наша народная беларуская песня" і інш.). Гэта спрыяла глыбокаму і праўдападобнаму адлюстраванню матываў сіроцтва, самаахвярнай матчынай любові, хараства беларускай прыроды, наогул, прыгажосці жыцця і працы.

Значную асаблівасць творчай постаці Цёткі заўважае В. Максімовіч, які лічыць, што ў яе творчасці "судакрануліся дзве літаратурныя плыні, дзве гістарычныя эпохі: адна, звязаная з творчасцю Ф. Багушэвіча і паэтаў народна-дэмакратычнага напрамку (А. Гурло, Я. Лучына, А. Гурыновіч і інш.), і другая, у многім шмат адрозная ад першай, "заканадаўцамі", паўнамоцнымі прадстаўнікамі якой сталі Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, З. Бядуля і інш., і, вядома, сама "паэтка рэвалюцыі" [33, с. 174–175]. Сапраўды, два вызначаныя напрамкі выяўлялі якасна іншыя адносіны да рэчаіснасці, да спосабу рэалізацыі "эстэтычнага ідэала", да поглядаў на жыццё.

Адпаведна, асоба Лесі Украінкі яднае лепшыя рысы ўкраінскага народа, якія ў значнай ступені выявіліся ў творчасці паэткі – гуманізм, прага свабоды Бацькаўшчыны, нянавісць да прыгнёту, мужнасць, аптымізм і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Яе паэтыцы ўласцівы выразнасць форм і інтанацый, афарыстычнасць выказванняў. Адначасова адсутнічае вычварнасць, якой супрацьстаіць шчырасць пачуццяў і глыбіня думак. Не выклікае сумнення таксама і тое, што сваёй творчасцю Л. Украінка спрыяла развіццю ўкраінскай літаратурнай мовы і ўдасканальванню мастацкай стылістыкі. Форма вершаў Лесі Украінкі здзіўляе таксама незвычайнай разнастайнасцю строфікі, метрыкі і рытмікі. У яе паэтычнай спадчыне знаходзім кананічныя санеты, актавы, сексціны, гекзаметры і інш.

Для творчасці ж Цёткі характэрна чаргаванне (часам – сутыкненне) супрацьлеглых, кантрасных эмоцый, што дазваляе ў поўнай меры адчуць само жыццё. В. Максімовіч падкрэслівае, што названая ідэя існуе ў непарыўнай сувязі з "рознахарактарным спектрам чатырох асноўных прыродных стыхій, сімваламі якіх выступаюць у Цёткі сонца (агонь, жар, маланка і інш.), зямля (ніва, трава, палетак і інш.), вада (рэчка, хваля, мора і інш.), паветра (перуны, вецер, віхор, бура, гром і інш.)" [8, с. 180]. Натуральна, ключавымі вобразамі паэзіі Цёткі (з названых чатырох) з'яўляюцца дзве стыхіі – паветра і вада. Безумоўна, іх асноўная функцыя не ў паказе пэўных прыродных з'яў, а, перш за ўсё, – узаемадзеянне з душэўным станам, адлюстраванне чалавечых намаганняў.

## Літаратура


1. *Быхавец, І.* "Хачу, арлы, ляцець з вамі!". Штрыхі да партрэта Цёткі / І. Быхавец // Роднае слова. – 1992. – №10. – С. 37–42.
2. *Рыльский, М.Ф.* Меж людей и с людьми / М.Ф. Рыльский. – М. : Мол. гвардия, 1982. – 222 с.
3. *Цётка.* Выбраныя творы / Цётка ; уклад., прадм. В. Коўтун. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – 336 с.
4. *Коўтун, В.* Стала песняю ў народзе: Асоба і творчасць Цеткі ў кантэксце станаўлення беларускай класікі : дапам. для наст / В. Коўтун. – Мінск : Нар. асвета, 2000. – 143 с.
5. *Тяпина, Я.Р.* Тема любви в творчестве Леси Украинки / Я.Р. Тяпина // Известия Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины. – №5 (26). – 2004. – С. 128–134.
6. *Украінка, Леся.* Вершы і паэмы / Леся Украінка. – Мінск : Нар. асвета, 1957. – 256 с.
7. *Каваленка, В.А.* Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіцце беларускай літаратуры XIX–XX ст. / В.А. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 336 с.
8. *Максімовіч, В.А.* Беларуская літаратура першай трэці XX ст. : вучэб. дапам. для студ. філал. спецыяльнасцей ВНУ / В.А. Максімовіч. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – 424 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова